Источник: "Наша слова" - 2015-04-29

# XXIII Гарэцкія чытанні

17 красавіка 2015 года ў філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры "Літаратурны музей Петруся Броўкі" адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя XXIII Гарэцкія чытанні "Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць", якія прысвячаліся 115 - годдзю з дня нараджэння Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага і 95 - годдзю першага выдання "Гісторыі беларускае літаратуры" Максіма Гарэцкага.

З уступным словам выступіла дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Макарэвіч. Яна прапанавала ўзгадаць хвілінай маўчання памерлага 15 красавіка Уладзіміра Содаля. Пасля адбыўся прагляд кінафільма "Рускі" (рэжысёр В. Аслюк, к/с "Беларусфільм") па матывах аднайменнай аповесці Максіма Гарэцкага. Потым з прывітальным словам выступаў славуты паэт Анатоль Вярцінскі.

Далей адбылося пленарнае паседжанне. На ім старшынствавалі: акадэмік НАН Беларусі Радзім Гарэцкі і член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Мушынскі. З дакладамі выступалі: Тамара Тарасава (Менск), Міхась Мушынскі (Менск), Тарэза Голуб (Менск), Радзім Гарэцкі (Менск), Роза Зінава (Менск). Вельмі цікавым быў даклад кандыдата філалагічных навук з Менска Вольгі Губскай, які меў назву "Па старонках Гарэцкіх чытанняў: спроба сістэматызацыі даследаванага".

Пасля пачосткі даследчыкі падзяліліся на дзве секцыі пад кіраўніцтвам Міхася Кенькі і Алены Гурскай. Выступалі славутыя навукоўцы: Уладзімір Навумовіч, Ігар Шаладонаў, Алена Гурская, Юрась Пацюпа, а таксама магістр філалагічных навук з Гомеля Алена Ярмоленка, якая агучыла даклад "Прастора і час у аповесці М. Гарэцкага "Камароўская хроніка".

Самым цікавым дакладам на 1-й секцыі было выступленне германіста і перакладчык з Менска Васіля Ермаловіча, якое мела назву "Аповесць Максіма Гарэцкага "Дзве душы" у перакладзе на нямецкую мову вядомым славістам і перакладчыкам Норбертам Рандаў". Удзельнікі з цікавасцю ўспрынялі гэты даклад. Нагогул, трэба адзначыць, што чытанні адбыліся паспяхова. Было вельмі цікава!

***Аляксей Шалахоўскі.***